ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (1017) ● ЧАЦВЕР, 7 чэрвеня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● **АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ** ● НАШЫ КАНДЫДАТЫ ● **У ВНУ КРАІНЫ** ● ЭКЗАМЕНУЕ СЕСІЯ ● **У БРАТНЯЙ БАЛГАРЫІ** ● ТАВАРЫШ ПРА ТАВАРЫША ● **ЭКСКУРСІІ** ● ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ ● **МЕСЯЧНІК БЯСПЕКІ РУХУ**

# АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

На пасяджэнні партыйнага камітэта заслухан і абмеркаван даклад нештатнага інструктара парткома БДУ Г. В. Грабешчанкі аб стане работы з маладымі камуністамі.

На ўліку ва універсітэце 214 маладых камуністаў. Яны маюць пастаянныя даручэнні, вядуць вялікую грамадскую работу, паказваюць прыклад у вучобе і працы. На факультэтах ва ўсіх партбюро выдзелены адказныя за гэты ўчастак работы, працуюць школы і сектары маладых камуністаў.

У прынятай пастанове, у прыватнасці, зазначана: кіраўніцтва сектарам па рабоце з маладымі камуністамі даручыць непасрэдна намеснікам сакратароў партбюро па арграбоце; праграму заняткаў у школах маладых камуністаў зацвярджаць на пасяджэнні партбюро.

Абмяркоўваючы работу камсамольскай арганізацыі факультэта журналістыкі, партыйны камітэт станоўча ацаніў яе намаганні ў барацьбе за павышэнне паспяховасці студэнтаў, іх ініцыятывы і актыўнасці ў грамадскім жыцці. Адзначаны і недахопы, выказаны прапановы для іх ліквідацыі.

***

Адным з галоўных на пасяджэнні савета БДУ было пытанне аб выніках навукова-даследчай работы ва універсітэце за 1972 год. Прарэктар па навуковай рабоце прафесар Л. В. Валадзько зрабіў дэталёвы аналіз дзейнасці факультэтаў і кафедр у гэтым напрамку, асвятліў стан студэнцкіх даследаванняў, выказаў меркаванні наконт перспектыўнага планавання навуковай працы. Асаблівая ўвага была звернута на актуальнасць тэматыкі і канцэнтрацыю навуковых сіл на рашэнні галоўных праблем, выкананне работ ва ўстаноўленыя тэрміны і пры абавязковай іх эфектыўнасці.

***

Адбылося пасяджэнне праўлення аддзялення таварыства савецка-балгарскай дружбы БДУ. Са справаздачным дакладам аб яго дзейнасці выступіў намеснік старшыні праўлення дацэнт гістфака Д. Б. Мельцар. Ён расказаў аб рабоце універсітэцкага аддзялення, аб сувязях БДУ з Сафійскім універсітэтам, навуковых кантактах беларускіх і балгарскіх вучоных, практыцы студэнцкіх груп у братняй краіне, кнігаабмене, які праводзіць універсітэцкая бібліятэка. Прафесар геафака В. Р. Заўрыеў прывёў цікавыя факты супрацоўніцтва географаў БДУ і Сафійскага універсітэта, паведаміў аб новых публікацыях і дыпломных працах беларускіх студэнтаў па балгарскай тэматыцы.

Дацэнт філфака, вядомы паэт і перакладчык балгарскай паэзіі Н. С. Гілевіч, падзяліўся сваімі творчымі планамі.

Абмеркаваны напрамкі далейшай дзейнасці аддзялення таварыства савецка-балгарскай дружбы. Старшынёй аддзялення выбран рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі.

## У ВНУ краіны

✦ **У Казанскім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Ульянава-Леніна** адбылася Усерасійская нарада па журналісцкай адукацыі. Удзельнікі нарады — дэканы факультэтаў журналістыкі, загадчыкі кафедр журналістыкі універсітэтаў Расійскай Федэрацыі, работнікі друку, радыё, тэлебачання, выдавецтваў абмяняліся вопытам падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў.

✦ **У Ленінградскім дзяржаўным універсітэце** прайшла першая міжвузаўская навуковая студэнцкая канферэнцыя па славянскай філалогіі, прысвечаная Дню славянскай пісьменнасці. Усяго на канферэнцыі працавала 11 секцый: па фанетыцы і словаўтварэнню славянскіх моў, фальклору, па тыпалогіі і сувязях славянскіх літаратур і іншыя.

✦ На факультэце грамадскіх прафесій **Краснаярскага універсітэта** адбыўся першы выпуск. 35 студэнтаў разам з асноўнай спецыяльнасцю атрымалі другую, грамадскую прафесію: лектара-актывіста, кіраўніка мастацкай самадзейнасці (драмгурткоў і мастацкага слова), кіраўніка фотагурткоў, прапагандыста асноў бібліятэчна - бібліяграфічных ведаў.

✦ Перад пачаткам экзаменаў на атэстат сталасці выпускнікі сярэдніх школ прыйшлі ў **Гомельскі універсітэт** на дзень адкрытых дзвярэй. Тут яны азнаёміліся з жыццём студэнтаў, агледзелі вучэбныя аўдыторыі і лабараторыі, атрымалі вычарпальныя адказы на свае пытанні.

✦ Журы «Тэатральнай вясны-73» падвяло вынікі конкурсу народных тэатраў Петразаводска. Спектакль студэнтаў **Петразаводскага універсітэта** па п'есе А. Арбузава «Таня» адзначан дыпломам І ступені.

✦ Кафедрай англійскай і французскай моў **Беларускага політэхнічнага інстытута** праведзен конкурс на лепшы пераклад тэхнічнага тэксту, у якім прынялі ўдзел 128 студэнтаў. Пераможцы ўзнагароджаны пахвальнымі граматамі.

## СУСТРЭЧА З КАНДЫДАТАМІ

Днямі адбылася сустрэча маладых выбаршчыкаў-студэнтаў універсітэта з кандыдатамі ў дэпутаты Кастрычніцкага раённага і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. На сустрэчы прысутнічалі Л. А. Вяржбіцкі — першы сакратар Кастрычніцкага РК КПБ (выбарчы ўчастак № 74), Н. С. Трафімава — майстар ГПТВ № 25 (участак № 1), Л. Т. Агароднік — студэнтка ІІ курса філфака (участак № 2), Б. Р. Шаматавец — наладчык вытворчага аб'яднання «Інтэграл» (участак № 3), К. К. Дзядышка — столяр вагонарамонтнага завода імя Мяснікова (участак № 4), Л. В. Валадзько — прафесар, прарэктар па навуковай рабоце БДУ (участак № 5).

Давераныя асобы пазнаёмілі прысутных з біяграфіямі кандыдатаў. У іх адрас было сказана многа шчырых і цёплых слоў.

З наказам ад імя выбаршчыкаў выступіў загадчык кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта прафесар А. В. Дулаў.

Л. А. Вяржбіцкі расказаў аб поспехах, дасягнутых Кастрычніцкім раёнам сталіцы ў дзевятай пяцігодцы, заверыў выбаршчыкаў, што кандыдаты ў дэпутаты прыкладуць усе сілы, каб апраўдаць аказанае давер'е.

**Наш кар.**

*НАШЫ КАНДЫДАТЫ*

## ЖЫВЕ ТАКІ ХЛОПЕЦ

— Толік? Добры таварыш... Свой, як кажуць, да апошняй запалкі...

— Цікавы, удумлівы юнак...

— Фізіка для яго — усё.

— Ён у нас лірык...

Ці не праўда, даволі супярэчлівыя характарыстыкі?.. І ўсе яны датычаць аднаго чалавека — студэнта фізічнага факультэта Анатоля Сакалоўскага. Цяпер на фізфаку сесія, і я сустрэла Анатоля са спартыўнай сумкай, даверху набітай кнігамі. Хутка залік...

— Не лічу сябе лепшым за іншых, — гаворыць мой субяседнік, — таму здзівіўся, што кандыдатам у дэпутаты раённага Савета вылучылі іменна мяне. Але давер'е апраўдаю. Цяжкасці? Ці мала іх было! А да адказнасці прывык яшчэ ў арміі.

Такі ён заўсёды — упэўнены ў сваіх сілах, цвёрды ў рашэннях. Пра сябе расказвае скупа, амаль неахвотна. У 1967 годзе закончыў школу. Потым працаваў, служыў у арміі. Ва універсітэт паступіў у 1971 годзе. Цяпер — намеснік сакратара камсамольскага бюро патока, член студэнцкага будаўнічага атрада. Захапляецца турызмам.

Мы гутарым толькі паўгадзіны, а здаецца, што ведаю Толю ўжо даўно. Хоць размаўляць з ім нялёгка: разважлівасць, сур'ёзнасць юнака ў першы момант здзіўляюць. Потым пачынаеш разумець, што гэта і ёсць тое асноўнае, што вылучае Сакалоўскага сярод аднакурснікаў. Ён — чалавек справы.

Тыя, хто хадзіў разам з Толем зімой мінулага года ў турысцкі паход па Заходняй Беларусі і Прыбалтыцы, сцвярджаюць, што такога можна браць у горы. І гэта вышэйшая ацэнка яго якасцей.

У дэканаце фізічнага факультэта лічаць, што Толя — даволі загартаваны, самастойны чалавек. Яго паважаюць усе — і сябры, і выкладчыкі.

**Л. ДРУЗЕВА.**



*З набліжэннем летніх канікул пачынаецца самая гарачая пара ў студэнтаў: залікі, экзамены, абарона курсавых і дыпломных работ.*

*НА ЗДЫМКАХ: ідзе залік па лінейнай алгебры ў студэнтаў І курса матфака, які прымае асістэнт Г. Л. Пятрова; (унізе) Дзяржаўная камісія аб'яўляе выпускнікам філфака вынікі абароны дыпломных работ.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*







# ДА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА—ГАТОВЫ!

На апошнім пасяджэнні бюро камітэта камсамола стаяла адно пытанне: гатоўнасць да трэцяга працоўнага семестра. Са справаздачай выступілі камандзір штаба працоўных спраў універсітэта Л. Жалудкоў і камісар С. Адаська.

Падрыхтоўчы перыяд падыходзіць к канцу. Поўнасцю сфарміраваны і ўкамплектаваны атрады. Усе байцы прайшлі медкамісію, здалі экзамены па тэхніцы бяспекі. Зараз камандзіры выязджаюць на месцы будучай дыслакацыі атрадаў, удакладняюць дагаворы і г. д.

Працягваюць работу штабы працоўных спраў факультэтаў. Аднак у некаторых з іх справы не зусім добрыя. Больш пасіўнымі сталі камандзіры штабаў хімфака, фізфака і ФПМ Г. Галалоб, А. Маёнаў і А. Ісачанка. Яны рэдка з'яўляюцца на пасяджэнні універсітэцкага штаба працоўных спраў, не выконваюць яго загады. На гэтых факультэтах дрэнна арганізавана падпіска на газеты. Фактычна не працуе штаб на філфаку. А камітэт камсамола гэтага факультэта не прымае ніякіх мер, каб выправіць становішча. Не трэба забываць, што ад таго, як пройдзе заключны этап падрыхтоўчага перыяду, залежыць далейшая работа СБА.

Зараз ва універсітэце напружаны час — сесія. Нягледзячы на гэта, працягваюць збірацца разам байцы атрадаў. Выпускаюцца насценгазеты. Не парываецца сувязь з дзіцячымі пакоямі міліцыі. У гэтым годзе з атрадамі выедуць 17 цяжкавыхоўваемых падлеткаў.

Прайшоў семінар лектараў, працягваецца работа па стварэнню агітбрыгад.

**Прэс-цэнтр камітэта камсамола.**

# НА ФІЗФАК ПРЫЙШЛА СЕСІЯ

Закончылася заліковая сесія. Адным яна прынесла поспех і бадзёры настрой перад экзаменамі, іншым...

Нешта зусім непрадбачанае здарылася ў 13-й групе I курса: шэсць чалавек атрымалі «незалікі» па гісторыі КПСС. Калі ўлічыць, што астатнія групы здалі гэты залік добра, то можна зрабіць вывад: прычына зрыву 13-й групы — несур'ёзныя адносіны саміх студэнтаў.

Значна лепш у параўнанні з мінулым семестрам прайшлі залікі па замежнай мове. У большасці груп няма ніводнага правалу.

На старэйшых курсах ужо адбылося некалькі экзаменаў. Сёмая група III курса здала даволі складаны прадмет — метады матэматычнай фізікі. Толькі чатыры чалавекі атрымалі здавальняючыя адзнакі, астатнія — выдатныя і добрыя. Многія групы IV курса не атрымалі ні адной пасрэднай адзнакі па навуковаму камунізму, добра абаранілі курсавыя работы.

Сёння на ўсіх курсах ужо ідуць экзамены. У калідорах фізічнага корпуса то там, то тут гаманлівыя натоўпы студэнтаў. Яны і падобныя і не падобныя на звычайных узбуджаных людзей пад дзвярыма з надпісам «Цішэй! Ідзе экзамен!» Дарэчы, надпісу няма, а натоўпы зусім не пад дзвярыма, а крыху ўбаку. Ідзе там дзелавое, спакойнае абмеркаванне пэўнай праблемы. Раз-пораз гучыць: патэнцыял, свабодная энергія, прастора... Ну, вядома, гэта ж радыёфізікі. Ад упэўненасці ў сваіх сілах ідзе гэты спакой.

У аўдыторыю № 373 мы зайшлі разам з экзаменатарам Уладзімірам Кліменцьевічам Прахарэнкам. Тут здае экзамен па статыстычнай фізіцы першая група III курса. Замест звычайных білетаў студэнты атрымліваюць адно пытанне, рыхтуюцца нядоўга. І вось перад сталом экзаменатара сядзіць з лісткамі, спісанымі формуламі, Аляксандр Аўцюшкоў. У яго заліноўцы добрыя і выдатныя адзнакі. Выдатных больш. Яго пытанне — «Энтрапія ў тэрмадынаміцы і статыстычнай фізіцы». Саша адказвае добра, упэўнена аперыруе тэрмінамі. І як вынік — выдатная адзнака. Выдатна атрымліваюць таксама Мікалай Скрыган, Уладзімір Барун і іншыя.

— Гэта група не выключэнне, — папярэдзіў маё пытанне Уладзімір Кліменцьевіч. — На аддзяленне радыёфізікі заўсёды вялікі конкурс. Сюды трапляюць самыя падрыхтаваныя і мыслячыя. Таму займаюцца ў асноўным роўна.

Мы развітваемся з III курсам, а экзамен працягваецца.

Ні пуху вам, ні пер'я!

**Л. РЫГОРАВА.**



*Экзамен па фізіцы космасу. Выдатна адказвае на пытанні выкладчыка Б. Ю. ХАНОХА—студэнт IV курса аддзялення радыёфізікі Уладзімір САСКАВЕЦ.*

*Фота Д. Чаховіча.*

# ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН У БАЛГАРЫІ

По накіраванню Беларускага рэспубліканскага і Усесаюзнага таварыства «Веды» я 10 дзён знаходзіўся ў НРБ. За гэты час у Сафійскім універсітэце і навукова-даследчым інстытуце чыгуначнага транспарту, на прадпрыемствах і ва установах Враца, Міхайлаўграда, у сельскай мясцовасці і іншых прачытаў 10 лекцый на тэму «Савецкі народ — новая гістарычная супольнасць людзей», на якіх прысутнічала звыш 1200 чалавек.

Па тэме лекцыі слухачы задалі больш 20 пытанняў: якія ўмовы садзейнічалі стварэнню Савецкай федэрацыі; як практычна здзяйсняўся некапіталістычны шлях развіцця нацый і народнасцей у СССР у працэсе сацыялістычнага будаўніцтва; правы і абавязкі аўтаномных рэспублік, аўтаномных абласцей і нацыянальных акруг; формы і метады кіраўніцтва эканомікай саюзных рэспублік з боку КПСС і Савецкага ўрада; які сярэдні заработак рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі і служачых; у чым сутнасць новых мерапрыемстваў КПСС па павышэнню матэрыяльнага ўзроўню жыцця савецкага народа; які размер стыпендый у савецкіх вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах; на якіх мовах вядзецца навучанне ў СССР і іншыя пытанні.

Лекцыі, як правіла, працягваліся 40—50 мінут і па просьбе слухачоў чыталіся на рускай мове. Прысутныя праяўлялі вялікую зацікаўленасць да канкрэтных пытанняў гаспадарчага і культурнага развіцця нашай краіны, горача адабралі ўнутраную і знешнюю палітыку КПСС і Савецкага ўрада, не раз заяўлялі, што ў СССР і НРБ ёсць толькі адно «спрэчнае» пытанне — хто каго больш любіць.

Балгары ганарацца гістарычнымі сувязямі з нашай краінай, высока ацэньваюць дапамогу СССР у развіцці эканомікі і культуры НРБ, уважліва сочаць за ўмацаваннем магутнасці СССР і сусветнай садружнасці сацыялістычных краін, добра ведаюць рускую і савецкую літаратуру, кнігі і артыкулы савецкіх аўтараў, прысвечаныя розным сацыяльна-эканамічным і навукова-тэхнічным праблемам.

Сустрэчы з балгарскімі слухачамі праходзілі выключна цёпла і сардэчна, адбываліся авацыі ў гонар вечнай і непарушнай балгара-савецкай дружбы. Вялікая ўвага была аказана з боку партыйных органаў, кіраўнікоў народных саветаў і Айчыннага фронту, таварыства па распаўсюджанню навуковых ведаў імя Георгія Кіркова.

Мне пашчасліва пабываць і ў гістарычных музеях, у памятных месцах рэвалюцыйна-вызваленчага руху, у кааператыве сяла Ліпніцы, на Чыпрадзіцкім горна-абагачальным камбінаце і дывановай фабрыцы, азнаёміцца са структурай ствараемых прамыслова-аграрных комплексаў, дзейнасцю культурна-асветніцкіх таварystваў і арганізацый.

Паездка ў многім узбагаціла мяне як выкладчыка грамадскай кафедры, і я ўдзячны яе арганізатарам за прадастаўленую магчымасць пабываць у цудоўнай і гасціннай братняй краіне, выступіць з лекцыямі, азнаёміцца з жыццём і бытам працоўных НРБ.

**І. СЯМЫКІН, дацэнт кафедры навуковага камунізму.**

# ДАСЛЕДУЮЦЬ СТУДЭНТЫ

Эфектыўнасць працэсу навучання і выхавання ў ВНУ ў многім залежыць ад арганізацыі кафедрамі навукова-даследчай работы студэнтаў. На кафедры навуковага камунізму, адной з маладых сярод кафедр грамадскіх навук, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў па-сапраўднаму стала разгортвацца ў час падрыхтоўкі да 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У значнай меры яна актывізавалася ў перыяд юбілейных урачыстасцей, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, 50-годдзю ўтварэння СССР.

З 1970 года і да цяперашняга часу кафедра далучыла да навукова-даследчай работы звыш 100 студэнтаў. Большасць з іх — гэта студэнты гістарычнага (перш за ўсё, філасофскага аддзялення і аддзялення палітычнай эканоміі), юрыдычнага, геаграфічнага і фізічнага факультэтаў, факультэтаў журналістыкі і прыкладной матэматыкі.

Тэматыка навуковых работ пачынаючых даследчыкаў даволі разнастайная і ахоплівае актуальныя праблемы станаўлення і развіцця камуністычнай грамадска-эканамічнай фармацыі, важнейшыя пытанні сучаснага сусветнага рэвалюцыйнага працэсу і ідэалагічнай барацьбы: «Утварэнне СССР — трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі», «Непарушнае адзінства і брацкая дружба народаў СССР — вялікая заваёва сацыялізму», «Фарміраванне новага чалавека — адна з галоўных задач КПСС у працэсе камуністычнага будаўніцтва», «Адзінства навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу ва умовах сацыялізму», «Сацыялізм і дасягненне сацыяльнай роўнасці жанчыны», «У. І. Ленін аб нацыянальна-вызваленчым руху», «Рэвалюцыйна-вызваленчы рух у краінах Лацінскай Амерыкі», «Некапіталістычны шлях развіцця» і іншыя.

У 1971-1972 гадах тэматыка студэнцкіх навуковых работ была арыентавана на раскрыццё цэлага раду праблем, якія вынікаюць з рашэнняў і матэрыялаў XXIV з'езда КПСС, у тым ліку: XXIV з'езд КПСС аб умацаванні баявога саюза асноўных рэвалюцыйных сіл сучаснасці; аб далейшым развіцці дружбы і супрацоўніцтва сацыялістычных краін; аб зменах у сацыяльнай структуры грамадства і ўмацаванні адзінства савецкага народа; аб умацаванні вядучай ролі рабочага класа ў камуністычным будаўніцтве; аб неабходнасці барацьбы супраць антыкамунізму як адной з важнейшых умоў поспеху рэвалюцыйных сіл сучаснасці; КПСС — партыя навуковага камунізму; перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у дзевятай пяцігодцы.

Навуковыя работы студэнтаў, як правіла, вызначаюцца глыбокім зместам, умелым прымяненнем марксісцка-ленінскай метадалогіі, рашэнняў КПСС і міжнародных нарад камуністычных і рабочых партый, даных сацыяльна-эканамічнай статыстыкі, перыядычнага друку, спецыяльнай літаратуры.

У 1970 і 1972 гадах 27 работ былі рэкамендаваны на рэспубліканскі конкурс. Першая катэгорыя была прысуджана работам студэнтаў гістарычнага факультэта: Л. Лойкі — «Развіццё КПСС ленінскіх ідэй аб матэрыяльным і маральным стымуляванні працы ў працэсе будаўніцтва сацыялізму і камунізму», В. Брыжахіна — «Ленінізм — аснова навуковага кіраўніцтва ідэалагічнай работай у Савецкай Арміі», І. Міхальчанкі «Рух французскай моладзі на сучасным этапе», Л. Бурдыкава «Пераадоленне культурна-бытавых адрозненняў паміж горадам і вёскай у працэсе камуністычнага будаўніцтва», студэнта геаграфічнага факультэта І. Грыгарчука «Некапіталістычны шлях развіцця». Работа студэнта IV курса гістарычнага факультэта Ю. Шабаля на тэму «Вялікі сын балгарскага народа (да 90-годдзя з дня нараджэння Г. Дзімітрова» ў трэцім туры IV Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых прац была ўдастоена першай прэміі.

Кіравалі названымі студэнцкімі даследаваннямі прафесар М. Р. Круцько, дацэнты П. П. Сіліванчык і А. М. Паўлючэнка, в. а. дацэнта М. П. Квочкін, ст. выкладчык І. І. Уласенка.

На пасяджэннях кафедры сістэматычна заслухоўваюцца справаздачы выкладчыкаў аб кіраўніцтве навуковымі дакладамі і рэфератамі, курсавымі і дыпломнымі работамі студэнтаў. Пасля XXX студэнцкай навуковай канферэнцыі БДУ былі абмеркаваны вынікі работы секцыі навуковага камунізму. Кафедра прыняла рашэнне аб расшырэнні і паглыбленні тэматыкі студэнцкіх навуковых дакладаў па праблемах тэорыі і практыкі сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва, аб далейшым прыцягненні ў навуковую работу студэнтаў біялагічнага, хімічнага, геаграфічнага і філалагічнага факультэтаў. На пасяджэнні кафедры зацверджаны канкрэтныя мерапрыемствы ў сувязі з падрыхтоўкай студэнтаў да маючага адбыцца ў наступным годзе конкурсу студэнцкіх навуковых работ.

**А. БЛІЗНЯКОВА, дацэнт кафедры навуковага камунізму,**

**І. СІДАРАЎ.**

# ЗНАЁМЦЕСЯ: ХАРКАЎСКІ ДРАМТЭАТР

Пачаў свае гастролі ў Мінску Харкаўскі дзяржаўны акадэмічны рускі драматычны тэатр імя А. С. Пушкіна. У рэпертуары тэатра п'есы савецкіх і зарубежных драматургаў: А. Карнейчука «Памяць сэрца», А. Макаёнка «Зацюканы апостал», А. Сафронава «Дзіўны доктар», Ю. Сямёнава і У. Токарава «Семнаццаць імгненняў вясны», В. Сарду, Э. Маро «Катрын Ляфеўр» і іншыя.

Тэатр створан у 1933 годзе. У ім працавалі такія майстры сцэны, як народныя артысты УССР В. М. Арыстаў, Л. Н. Колабаў і іншыя.

За 40 год існавання тэатр паставіў каля 300 спектакляў. Трывалае месца ў рэпертуары занялі спектаклі з вобразам У. І. Леніна. Гэта «Чалавек з ружжом», «Крамлёўскія куранты» Н. Пагодзіна, «Шостае ліпеня» М. Шатрова, «Ёсць такая партыя» І. Рачады. Вобраз У. І. Леніна цяпер стварае на сцэне народны артыст УССР Ю. П. Жбакаў.

Узначальвае тэатр галоўны рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў УССР Уладзімір Іванавіч Нянашаў.

Сёлетнія гастролі калектыў тэатра разглядае як творчую справаздачу да свайго 40-годдзя.

На спектакль па п'есе У. Канстанцінава і Б. Рацэра «Прахадны бал», які адбыўся ў памяшканні ТЮГа, білеты дастаць было не так проста. Надзеі гледачоў апраўдаліся. Спектакль атрымаўся вясёлы, жывы, цікавы. Узнагародай акцёрам былі шчырыя апладысменты ўдзячных гледачоў, большасць з якіх—моладзь, студэнты і школьнікі.

**Л. АРЛОВА.**

# ПАЧУЦЦЁ ВЫШЫНІ

Наша першая сустрэча была, напэўна, самай звычайнай. Я ўдзельнічала ў веснавым кросе, які праходзіў на Камсамольскім возеры. Да старту заставалася некалькі хвілін, спартсмены хваляваліся, напружанасць адчувалася ва ўсім. Можа іменна таму я звярнула ўвагу на высокую, стромкую дзяўчыну, якая спакойна і сур'ёзна размінапася. Цяпер я не магу сказаць, што менавіта зацікавіла мяне ў гэтай спартсменцы, ці то сур'ёзнасць, ці нейкая сіла яе рухаў, але тады я не адрывала ад яе позірку.

Старт! 1 мін. 12 сек.—фініш! Пераможца — Вольга Ярута, студэнтка V курса біяфака. Так мне стала вядома імя зацікавіўшай мяне дзяўчыны.

А потым было знаёмства, былі сустрэчы з Оляй.

Аб сабе яна гаворыць мала, больш аб сябрах, аб сваім трэнеру В. В. Зарэцкай і, вядома, аб спорце. Трохі саромеючыся, Оля прызнаецца:

— Ведаеш, не ўяўляю сябе без біяфака і спорту. Бывае, што прапусціш трэніроўку, ну, напрыклад, з-за траўмы, і нечага не хапае, наогул, зусім іншыя адчуванне, настрой.

Дарэчы, трэніроўкі — пяць разоў у тыдзень, амаль кожны дзень. Цікаўлюся, як удаецца спалучаць паспяховую вучобу з заняткамі спортам. Гэта ж не так лёгка, напэўна, узнікае іншы раз «праблема»: ці спорт, ці паспяховасць?

— Зусім наадварот, — сцвярджае Вольга, — мне здаецца, што заняткі спортам неяк сістэматызуюць распарадак дня. Нездарма кажуць, што чым больш у чалавека спраў, тым больш ён паспявае зрабіць. Як гэта растлумачыць... Разумееш, спорт не дае расслабляцца, уступаць сваім мімалётным парывам, ён дапамагае жыць з поўнай аддачай сіл.

Оля расказвае аб спаборніцтвах, на якіх яна выступала ў складзе зборнай універсітэта. Была дзяўчына ў Маскве, Баку, Ленінградзе.

— Часцей за ўсё я бягу ў эстафеце. Мне здаецца, што іменна тут пазнаецца таварыш, іменна ў эстафеце больш ярка раскрываецца сутнасць слоў «спартыўная дружба» і, напэўна, асабліва цяжка прайграваць у эстафеце. Тут двайная віна: перад сабой, трэнерам і перад сябрамі па эстафеце, па камандзе. Наогул, прайграваць цяжка, вельмі цяжка. Але тады з яшчэ большай энергіяй, нейкай спартыўнай добрай злосцю займаешся на трэніроўках, разумеючы: пераможа мацнейшы. Трэніруешся да знямогі, а ў галаве: «Прайграла таму, што працавала мала. Займацца, займацца, з поўнай аддачай, з поўнай...».

Оля ўсміхнулася: можа поўная аддача і нараджае рэкорды.

І я нарэшце зразумела, што прыцягнула мой позірк да Олі тады, на Камсамольскім возеры, зразумела, чаму з ёй так проста і лёгка гаварыць, чаму Вольга так часта паўтарае словы «жыць з поўнай аддачай». І мне падумалася, што гэта поўная аддача нараджае не толькі рэкорды, але і імкненне руху, энтузіязм, мэтанакіраванасць, нараджае пачуццё вышыні.

**Т. СКІБІЦКАЯ.**



*ГОРАД НАСТУПАЕ. Фота В. ЖУКА.*

**ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ— НАШЫ СЯБРЫ**

# ЗДАРОЎЕ Ў ПАРАДКУ—ДЗЯКУЙ, ЗАРАДКА!

Ранішняя зарадка мае каштоўнае гігіенічнае значэнне для чалавека любога ўзросту. Пасля сну мозг і ўсе астатнія сістэмы арганізма знаходзяцца ў затармажаным стане. З дапамогай ранішняй зарадкі здзяйсняецца як бы рабочая настройка цэнтральнай нервовай сістэмы. Акрамя таго, ранішняя гімнастыка развівае і ўмацоўвае апорна-рухальны апарат, органы дыхання.

Выконваць зарадку рэкамендуецца ў добра праветраным пакоі з адкрытай фортачкай або на свежым паветры. Займацца пажадана ў лёгкай спартыўнай форме або аголеным па пояс, прымяняючы наступныя водныя працэдуры — абціранне, abліванне, душ.

Характар ранішняй гімнастыкі павінен адпавядаць узросту і стану здароўя, трэніраванасці. Канкрэтных парад аб колькасці паўтарэння рухаў даць нельга, таму што арганізм кожнага чалавека па-рознаму рэагуе на фізічныя практыкаванні. Нагрузку ў час зарадкі трэба рэгуляваць, арыентуючыся на самаадчуванне пасля выканання ўсяго комплексу практыкаванняў. Аб'ектыўны паказчык — колькасць сардэчных скарачэнняў у мінуту (пульс). У чалавека ўзросту 18—25 год пасля выканання ранішняй гімнастыкі пульс можа ўчасціцца на 25—50 працэнтаў ад зыходнага ўзроўню. На працягу 6—8 мінут пульс павінен прыходзіць у норму. Гэта будзе сведчыць аб тым, што атрымліваемая фізічная нагрузка адпавядае магчымасцям арганізма.

У апошні час рад даследчыкаў, а таксама прафесар М. М. Амосаў выказваюцца за неабходнасць павелічэння нагрузкі ў час ранішняй гімнастыкі. Так што не варта баяцца стомленасці і трэба больш рашуча выкарыстоўваць зарадку для ўмацавання сардэчна-сасудзістай і мышачнай сістэмы.

У заключэнне прывядзем прыкладны комплекс ранішняй гімнастыкі для практычна здаровага чалавека ўзросту 18—25 год.





**Комплекс ранішняй гімнастыкі**

**Практыкаванне 1.** Хадзьба на месцы або з рухам наперад. Затым бег на месцы (на насках у спакойным тэмпе на працягу 2—3 мінут з далейшым пераходам на хадзьбу).

**Пр. 2. З. С.** (Зыходнае становішча) — асноўная стойка, рукі ў бакі. На лік 1—4—кругавыя рухі рукамі наперад, 5—8 — кругавыя рухі рукамі назад. Выканаць практыкаванні па 3—4 разы.

**Пр. 3.** З. С.—ногі паасобку, рукі на пояс. 1—3—тры пружыністыя нахілы ўправа ў спакойным тэмпе — выдых; 4—выпраміцца — удых; 5—7 — тры пружыністыя нахілы ўлева—выдых; 8—выпраміцца — удых.

**Пр. 4.** З. С.—асноўная стойка. 1—прысесці, рукі наперад; 2—падымаючыся, паварот тулава, направа з махам рукамі ў бакі — удых; 3—прысесці, рукі наперад—выдых; 4 — паўтарыць лік 2 з паваротам улева — ўдых. Паўтарыць усё практыкаванне 7—10 разоў.

**Пр. 5.** З. С.—ногі паасобку. 1—3—тры пружыністыя нахілы ўперад — выдых; 4—выпраміцца і злёгку прагнуцца — удых. Паўтарыць 6—9 разоў.

**Пр. 6.** З. С.—асноўная стойка, рукі ў бакі. 1—мах левай нагой уперад; 2—прыставіць нагу; 3—мах правай нагой уперад; 4—прыставіць нагу; 5—8—тое ж з махам нагой улева і ўправа. Дыханне не затрымліваць. Зрабіць 5—8 махаў кожнай нагой.

**Пр. 7.** З. С.—упор лежачы. Згінанне і выпрамленне рук. Выконваць да стомленасці, не затрымліваючы дыхання.

**Пр. 8.** З. С.—лежачы на спіне. 1—падняць прамыя ногі да вугла 30—40° да падлогі—удых; 2—апусціць ногі—выдых; 3—сесці, працягваць выдых; 4—легчы. Паўтарыць 10—15 разоў.

**Пр. 9.** Хадзьба па пакоі з махамі рук у розных напрамках.

**Пр. 10.** З. С.—ногі паасобку, рукі на пояс. 1—3—павольна прагнуцца назад—выдых; 4—выпраміцца—удых. Паўтарыць 3—5 разоў.

**Пр. 11.** Кругавыя павароты галавой улева і ўправа, 6—9 разоў.

**Пр. 12.** Падскокі на насках на месцы. 30—40 разоў. Затым адпачыць і паўтарыць 2—3 разы. Падскокі рабіць як мага вышэй, дыханне не затрымліваць. Пасля выканання падскокаў пахадзіць, робячы практыкаванні на расслабленне, пакуль дыханне не прыйдзе ў норму.

Практыкаванні на сілу рук і мышц брушнога прэса рэкамендуем праз 1—2 тыдні рэгулярных заняткаў паўтараць яшчэ 1—2 разы.

**У. РЭЙЗІН,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

# МЕСЯЧНІК ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Бадай, кожны ў апошні час звярнуў увагу на вуліцах горада на аўтобусы, тралейбусы, трамваі, упрыгожаныя транспарантамі з прыкладна такім тэкстам: «З 15 мая па 15 чэрвеня ў нашай краіне праводзіцца месячнік бяспекі дарожнага руху». Гэтаму ўсесаюзнаму мерапрыемству нададзена вялікае грамадскае значэнне. У яго ўключыліся работнікі міліцыі, калектывы прадпрыемстваў, навучальных устаноў.

Першыя вынікі месячніка паказалі значнае скарачэнне колькасці дарожна-транспартных здарэнняў у нашым горадзе. Але ці дае гэта права лічыць, што ў нашай сталіцы наведзен поўны парадак у руху транспарту і пешаходаў? Канешне, не. Дарожныя няшчасці, на жаль, адбываюцца і прымушаюць трывожыцца.

21 мая на вуліцы Я. Коласа пры дарожна-транспартным здарэнні загінула жанчына. Цяпер праводзіцца расследаванне, і мы не будзем спяшацца з вывадамі, але факт застаецца фактам: наезд на чалавека адбыўся ў 32-х метрах ад пешаходнага пераходу, там, дзе пераход вуліцы правіламі руху не прадугледжан.

Сур'ёзную пагрозу для бяспекі руху ўяўляюць п'яныя вадзіцелі і пешаходы. Пры іх удзеле адбыліся чатыры дарожныя няшчасці. Аляксандр Празецкі, напрыклад, п'яны, не маючы вадзіцельскіх правоў, самавольна сеў на чужы матацыкл і вырашыў праехацца. На вуліцы Сядых Празецкі не справіўся з упраўленнем і перакінуўся. Падобныя факты сведчаць, што дысцыпліна на вуліцы пакуль што не на належным узроўні.

**Р. АЎРАМЕНКА,**
**інструктар ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**

# МІМАХОДЗЬ

У Англіі існуе правіла, адпаведна якому наведвальнікі чытальных залаў, што засынаюць над кнігай, прыгаворваюцца да грашовага штрафу.

●

Помнік невядомаму чытачу узведзен у гарадку Тэк (зямля Бадэн-Вюртэнберг, ФРГ) па рашэнню мясцовай газеты. Гэта адзіны ў свеце помнік аматарам кнігі.

●

У Алжыры ёсць возера, вадой якога можна пісаць на паперы. Справа ў тым, што ў гэтую «прыродную чарніліцу» ўпадаюць дзве невялікія ракі: вада адной з іх багата солямі жалеза, другой — гумінавымі рэчывамі. Сумесь гэтых вод і ўтварае вадкасць, якая падобна на штучнае чарніла.

●

Гарадскія ўлады партугальскага горада Менха прыдумалі арыгінальны спосаб для абуджэння ў грамадзян цікавасці да чытання. Па вуліцах правялі чараду аслоў і вярблюдаў. У кожнага з іх на шыі віселі шыльдачкі: «Толькі мы не чытаем кніг».

●

У Францыі існуюць дзве літаратурныя прэміі, якія штогод прысуджаюцца... двум самым дрэнным кнігам года. Адна з гэтых прэмій—«Нана»—прысуджаецца самаму неталенавітаму твору, створанаму мужчынай. Другая прэмія — «Жуль» — адзначае самую дрэнную кнігу, напісаную жанчынай. Як лёгка здагадацца, у кандыдатах на гэтыя прэміі недахопу няма.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
АТ 06171 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ 687.
Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.